УДК 61:615.1(043.2)
ББК 5:52.82
ISBN 978-985-21-0251-3


*Клемяціч Я. Ю., Кашэўскі А. В.*

**БОЛЕВЫ СІНДРОМ У АДДАЛЕНЫМ ПЕРЫЯДЗЕ ПАСЛЯ ТАТАЛЬНАГА ЭНДАПРАТЭЗАВАННЯ ТАЗАСЦЕГНАВОГА СУСТАВА**

***Навуковы кіраўнік асіст. Цітова А. Д.***
*Кафедра траўматалогіі і артапедыі*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

**Актуальнасць.** Першая паспяховая імплантацыя татальнага эндапратэза тазасцегнавога сустава была праведзена яшчэ ў 1938 годзе, але пратэз быў не дасканалы, што выклікала шмат ускладненняў. У апошнія дзесяцігоддзі выконваецца вялікая колькасць аперацый татальнага эндапратэзавання, аднак, нягледзячы на прагрэс у сусветнай хірургічнай практыцы, аддаленыя станоўчыя вынікі пасля аперацыі эндапратэзавання назіраюцца толькі ў 76-89% аперыраваных пацыентаў. Асноўнымі фактарамі, якія зніжаюць якасць жыцця пасля аперацыі, з'яўляюцца: нестабільнасць, інфекцыі, звіхі, неўралагічныя захворванні і болевы сіндром. Згодна з замежнымі крыніцамі, у 32-35% пацыентаў у тэрмін назіранння ад года да 10 гадоў пасля аперацыі пры адсутнасці іншых ускладненняў адзначаюцца новыя адчуванні ў выглядзе болевага сіндрома, альбо дыскамфорту ў вобласці тазасцегнавога сустава. Захаваны, або ізноў узнікшы болевы сіндром знішчае станоўчы вынік эндапратэзавання і выклікае негатыўную рэакцыю ў пацыентаў, бо асноўная падстава, якая падштурхвае да аперацыі, – гэта пазбаўленне болю.

**Мэта:** вывучыць аддаленыя наступствы татальнага эндапратэзавання тазасцегнавога сустава і болевы сіндром у прыватнасці.

**Матэрыялы і метады.** Праца заснавана на анкетаванні 214 пацыентаў пры дапамозе мадыфікаванага апытальніка РНДІТА ім. Р.Р. Врэдэна "Апытальнік болевага сіндрома", які складаецца з двух раздзелаў, кожны з якіх змяшчае 5-6 пытанняў аб характары, лакалізацыі, інтэнсіўнасці і часе ўзнікнення болю, а таксама аб даўжыні канечнасці. Частцы пацыентаў таксама было праведзена клінічнае даследаванне.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У выніку працы былі вывучаны паказанні да аперацыі, пасляаперацыйныя наступствы, частата, падставы і механізмы ўзнікнення болю ў пацыентаў з эндапратэзам тазасцегнавога сустава.

**Высновы.**

1. Частым аддаленым наступствам татальнага эндапратэзавання тазасцегнавога сустава з'яўляецца болевы сіндром.
2. Пацыентам з болевым сіндромам пасля эндапратэзавання не прызначаецца належнае абследаванне і лячэнне на амбулаторным этапе.
3. Падставы захавання болевага сіндрома пасля ТЭТС даволі разнастайныя ад ідэапатычнага болю да нестабільнасці кампанентаў эндапратэза.

Репозиторий БГМУ